БІБЛІЯТЭКА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

БИБЛИОТЕКА СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ

Валянціна ГІРУЦЬ-РУСАКЕВІЧ

# НА НІТЦЫ ЧАСУ

ВЫБРАНАЕ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2018

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
Г51

**Гіруць-Русакевіч, В. Ф.**
Г51 На нітцы часу : выбранае / Валянціна Гіруць-Русакевіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2018. — 200 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).
ISBN 978-985-581-180-1.

Асноўная тэма вершаў у новай кнізе “На нітцы часу” Валянціны Гіруць-Русакевіч – любоў ва ўсім шматгранні гэтага пачуцця: да Радзімы, яе незабыўных краявідаў і людзей, якія жывуць тут, а таксама сваіх каранёў і парасткаў, матчынай мовы. І, вядома ж, каханне... І праз усё гэта – роздум аб пражытым-перажытым. Згадкі і спадзяванні...

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-180-1**
© Гіруць-Русакевіч В. Ф., 2018
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2018

# СТАРОНКА ДАРАГАЯ

*Зямелька любай Беларусі,*
*Прыгожая, гасцінная,*
*Я сэрцам за цябе малюся,*
*Як маці, ты — адзіная.*

***

Матуля любая, старонка дарагая,
Дазволь схіліць з удзячнасцю калені
За кожны год, і дзень, і за імгненне,
Што тут, у гэтым краі, пралятае.
Дазволь узнесці светлую малітву
За кожны ўздых з табой
Святому Небу,
За тое, што не за сваю прашу патрэбу
Усявышняга, а каб табе
паслаў Ён літасць.
Табе, мая прасветлена святая,
Абмытая вадзіцаю крынічнай,
Як самай яркай зорцы, а не знічцы,
Што падае, — я веру й прысягаю.
Ты не ўпадзеш, а будзеш
палымнецца
Усё ярчэй, праменнямі любові
Асвечваць шлях, і клікаць
родным Словам,
І наталяць ім нашы душы, сэрцы.

Усявышні! Зберажы маю Радзіму
Ад хціва-неразумнага, ліхога,
Каб годнай, светлаю была дарога
Яе, Матулі любае, адзінай.
Дазволь яе палеткаў быць
пясчынкай,
Крыніцы кропляй, ноткаю ў песні,
Што льецца над зямлёй
парою весняй,
Любові полымя — хаця б іскрынкай...
І разам з тым — быць вольнай,
гордай птушкай
У гэткім вольным, гордым,
годным краі,
Якому ў вернасці, любові прысягаю,
Як маці любае ўдзячная дачушка.

## ДЗЯКУЙ

Дзякуй, Божухна, Табе за тое,
Што і я — дачка старонкі роднай,
Той, што сэрца мне заўжды спатоліць
Песняй мовы любае, лагоднай.

Узрасла і я з таго карэння,
Што навекі ў гэтае зямліцы,
Каб удзячна, цераз пакаленні,
Зноў і зноў з крыніц яе напіцца,

Наталіць душу жывой вадою,
Памяццю і сэрцам прычасціцца,
Каб жыцця віхуры ўсе адолець,
Хто я і адкуль — каб не забыцца.

Каб лампадка сэрца не астыла,
Саґравала тых, хто сёння ў золі.
Дзякую, і дай святое сілы
Быць дачкой, а падчаркай — ніколі.

Не ўцякаць за шчасцем аж за мора,
Са сваёй зямлёй-матуляй зліцца.
Калі гора — разам і агораць,
А ўцешна — разам весяліцца.

Дзякую. І словам роднай мовы
Гавару, спяваю і малюся
За жыцця выток мой і аснову —
За людзей, зямельку Беларусі!

І ніякія жыццёвыя завеі,
Ні дажджы, ні ветру злыя выверты
Мне душу і памяць не сумеюць
Ні заснежыць, ні змыць, ні выветрыць.

## МОЙ ВЫТОК

Між зямель Валожынскай
і Іўеўскай
Ёсць куток, які заўжды прытуліць,
Што мне стаў вытокам і калыскаю —
Вёска Міхайлоўшчына-матуля.
У лугавыя травы ўплятаецца
Каснічок ракі, Клявой завецца,
Вербы з вольхамі над ёй
схіляюцца,
Нібы ў люстэрка паглядзецца.
А Клява дарогаю знаёмаю

Праз вякі нясе сваю вадзіцу
Цераз Гаўю да сівога Нёмана,
Каб з яго вадою перавіцца...
Там, за рэчкай, лес
грыбова-ягадны,
Гэткі шчодры восенню і летам,
Таямніцаю сваёй прыцягвае,
Просіць за грыбочкамі пабегаць,
Пакланіцца россыпу сунічнаму
І падсіненых чарніц палянам...
І раздорвае дабро сваё
прывычна так —
З чым прыйшоў хто: з кошыкам
ці збанам...
А з вядром — бяры, як можаш,
вёдрамі!
Гэтак і салодкую маліну —
Вунь як прыгінаюцца
пад шчодрымі
Ягадкамі колкія галіны!

Любая, прыгожая, лагодная
Вёска — лепшай, пэўна,
ужо не будзе.
Сустракаюць тут мяне,
як родную,
Землякі — найбліжэйшыя мне людзі.
Ты павер маім даччыным словам:
Я вярнуся ў куток, што светла сніцца,
Шчэ не раз — прызнацца ў любові,
З пакаяннем нізка пакланіцца.

## ЗЕМЛЯКАМ

Вось і сталася наша сустрэча,
Дарагія мае землякі!
Дня вам добрага!
Добры вам вечар!
Для мяне вы ўсе — сваякі.

Для мяне вы ўсе дарагія,
І суседзі — нібыта радня.
Сэрца ў радасці соладка ные,
Хвалявання ніяк не суняць...

Колькі год не была з вамі разам?
Сэрцу слёзна-балюча ажно...
Толькі ж сэрца не ўладнае часу,
І сягоння між вас я ізноў.

Шлю паклон табе, родная вёска,
Вам, сябры мае, цёткі, дзядзькі.
З вамі мне так утульна, па-свойску,
Дарагія мае землякі!

## ВЁСАЧКА-МАТУЛЕЧКА

У расінцы кожнай сонейка іскрыцца,
І пяе-шапоча пушча Налібоцкая,
Я хачу сваёй зямельцы пакланіцца
І прызнацца ў любові роднай вёсачцы.

Наша вёска, наша вёсачка-матулечка,
Ты ўсіх сваёй пяшчотаю атульваеш,
Працавітая, увішная, лагодная,
Найгасціннейшая вёска наша родная!

Каласіцца, спее ніва залатая
І хвалюецца прыгожа пераліvамі…
Хай жа вёсачка ніколі не ўмірае —
Наша матухна-карміцелька руплівая.

Наша вёска, наша вёсачка-матулечка,
Ты ўсіх сваёй пяшчотаю атульваеш.
Працавітая, увішная, лагодная,
Ты жыві заўсёды, вёска наша родная!

Наша любая, святая працаўніца,
Ты была заўжды руплівіцай нястомнаю.
За цябе і за людзей тваіх маліцца
Буду, вёсачка-матулечка, штодзённа я.

Наша вёска, наша вёсачка-матулечка,
Ты ўсіх сваёй пяшчотаю атульваеш.
Працавітая, увішная, лагодная,
Ты жыві ў шчасці, вёска наша родная!
Працавітая, гасцінная, лагодная,
Ты жыві заўсёды, вёска наша родная!

## МАЯ МАЛЕНЬКАЯ РАДЗІМА

Ці я змагу ўсе словы адшукаць,
Куточак родны, дарагі, адзіны,
Каб гімн любові да цябе спяваць,
О, любая маленькая радзіма!

Каб зноў апець красу тваю жывую,
З пяшчотаю, з любоўю расказаць,
Як жнівень сонцам збажыну цалуе
І вабіць траўным шоўкам сенажаць,

Як рэчка прахалодай спеўна кліча,
Праводзіць восень журавоў у шлях,
Як ногі коле босыя, казыча
Іржышча на пакошаных палях,

Як аплятае травы павуцінне
І ззяе ўранку іскрамі расы,
А ў бацькоўскай роднае хаціне
Так малітоўна свецяць абразы…

Знаёмай вечароваю дарожкай
Да рэчкі йду, спяшаюся ля саду,
Дзе ціха шэпчуць клёны і бярозкі
Пра шчасце, маладосць, кахання радасць…

О, мілая маленькая радзіма!
З удзячнасцю схіляю галаву
За сцежкі, па якіх тады хадзіла,
За ўсё, што родным і цяпер заву.

## ТАМ, У ДЗЯЦІНСТВЕ...

Там — рэчка яшчэ не змялелая
І буйная квецень лугоў…
Не бегла, здаецца, — ляцела я
Да хараства таго
Па палявой сцяжынцы
Між каласення жытоў…
Вось бы вярнуцца ў дзяцінства
Хоць на хвіліначку зноў!

У тую вясну пявучую,
Летнюю бесклапотнасць,
У школьным званком абуджаную
Раннюю цуда-восень,

У зімкі сумёты шчодрыя
З гэткімі ж маразамі…
Тыя малюнкі, той водар мне
Ноч толькі дорыць снамі.

## АДКУЛЬ НАЗВА?

*(паводле аднаго з паданняў)*

Спытаеце, адкуль жа назва
У Міхайлоўшчыны, у вёскі?
Падумаем, давайце, разам
Аб тым з падання адгалоскам...
Якімі ж гэтыя мясціны
Былі ў сівое даўніне?
Стагоддзяў заслону адкіну
І бачыцца такое мне…

Лугі ў травах сакавітых
Істужкай рэчкі перавіты,
У ёй плюскоча срэбна рыба
На розны густ... Ну, а сялібаў
Амаль не бачна ў наваколлі,
І ўрадлівае скрозь поле...
Вакол лугоў тых і палеткаў
Гамоніць лес таемна гэтак
Лісцём бярозава-дубовым,
У іх гоман уплятаюць словы
Асін і клёнаў, вязаў лісці
І арабін... І лапкі хвояў
Вядуць размовы між сабою....
А ў лесе, як цяпер гавораць,
Грыбоў — касі хоць! Ягад розных,
Звяр'я і птушак — не злічыць!..

Рай на зямлі сапраўдны, проста,
Дзе ўсім прывольна, добра жыць.

Адночы выйшаў тут да рэчкі
Вандроўнік з лесу малады:
— Мясціна — цуд! А што, дарэчы,
Каб пасяліцца мне сюды?
Багаты лес, а ў рэчцы рыбы —
Кішыць аж! Будзе добры ўлоў.
Збудую тут сваю сялібу,
Відаць, сам лёс мяне прывёў
У гэту цудную мясціну...
Так думаў-разважаў Міхайла
(Імя такое меў юнак).
І хутка ён прыжыўся так
У куточку гэтым гожым, слаўным,
Што й людзі іншыя гурмою,
Пра месца чуючы такое,
Дзе лес і рэчка, родзіць ніва,
Прыйшлі і зажылі шчасліва.

Міхайла ж быў хлапчына знатны:
Да працы да любое здатны,
Вясёлы, спрытны, гаваркі,
Прыветны, мілы, акуратны —
Адзін на тысячы такі.

— Ну што за хлопец,
 што за ўдалы —
Адзін шчыруе за траіх!
Так маладзіцы ўсклікалі
У акрузе, і ўсе назвалі
Міхалкамі сыноў сваіх.
Бадай, што й дома не бывала,
Дзе б ні было свайго Міхала...

Міхайлу ж з добраю дзяўчынай
Тут хутка доля заручыла.
Надзіва гаспадарка стала —
Так разам ладзілі ўдала.
І паляваў ён, і рыбачыў,
І поле засяваў... Няйначай
Пусціў тут карані навек
Міхайла — добры чалавек.
І ў Міхаліны-гаспадыні
Таксама спрыту не адымеш —
Усё “гарэла” пад рукамі...
І ўжо сыночак іх з сябрамі
Гуляў у родным наваколлі,
Дзе ім забаў было даволі...

Праходзілі ці праязджалі
Тут незнаёмцы, кожны раз
Калі ў хлапчукоў пыталі,
Завуць як, чулася ў адказ,
Бы рэха нейкае наўкола:
— Міхал...
— Міхалка я...
— Міхайлік...
І перакрыў усе галасы
Упэўнены і смелы голас:
— І мяне Міхайлікам назвалі,
Ды я яшчэ й Міхайлы сын!
Здзіўлёна людзі пaглядалі:
— Міхайлаў колькі, ну і ну!
Імёны ўсіх адным гучалі.
Так Міхайлоўшчынай назвалі
Мясціну гэту ў даўніну.

Ці ёсць тут праўда — хто праверыць,
Вадзіцы ж столькі ўцякло
У рэчцы нашай... А я веру,
Што сапраўды так і было!

І хочацца, каб апраўдалі
І сёння назву вёскі людзі —
Пабольш сыночкаў нараджалі,
Дачушачак не забывалі...
Хай весела ізноў тут будзе!

## СПАТКАННЯ РАДАСЦЬ

І зноў з табой я, вёсачка мая,
І зноў я з вамі, землякі-суседзі!
У жыццёвым моры, нібыта маяк,
Маленькая радзіма кліча-свеціць.

І я сюды плыву, бягу, лячу —
Да родных ніў, да блізкіх мне
людзей,
Каб адпачыць душой і зноў адчуць,
Што лепей не бывае анідзе.

Не госцяй пачуваці, а дачкой
Хачу цераз расстайныя гады,
На ўзлесках гэтых і па-над ракой
Удыхаць радзімы найгаючы дым.

Шчаслівая, што зноў і зноў магу
Вось так, па-роднаму,
з усімі я сустрэцца
І да сустрэчы новай берагу
Спаткання радасць
у даччыным сэрцы.

# ВЁСЦЫ

— Жыві! — шапчу, як заклінанне,
Хапаючыся за надзею,
Што вёска ажыве, паўстане!
Ды ўсё яна не маладзее...
Вяртае памяць у былое,
А будучыні як не бачна...
І, заціхаючы, сумуе,
Травой няскошанаю плача.

Амаль няма каму расіцу
Збіваць з лугоў затравянелых.
І ёй, як мне, больш толькі сніцца
Пракос, пракладзены ўмела
Рукой напрацаванай, дужай,
Пах сена свежага мядовы...
Мы пра сустрэчу марым, дружа,
Сустрэнемся ж — і комам словы
Нясцерпнай гаркаты ў горле: Былыя
“зношаны” абновы,
Ажно сціскае сэрца болем.

І нашая Крыніца Ведаў
Мялела ўсё, пакуль не сціхла
Зусім... Хто пра такое ведаў
Самотнай адзіноты ліха?..
Хто думаў некалі, што вёска —
Карміцелька-матуля наша —
Былога стане адгалоскам,
Пра будучыню й ці раскажа?..

Як птушкі з роднага гняздоўя,
Зляцелі дзеці-птушаняты.
Яна ж з матулінай любоўю

Чакае: вернуцца дахаты —
Не ў госці, а гаспадарамі...
І з той надзеяю нясмелай
Глядзіць усё на шлях вачамі
Сваіх хацін асірацелых.

Даруй мне, вёсачка-матуля,
За ўсіх тваіх няўдзячных дзетак.
Бывае, пэўна, й ім няўтульна,
Як мне, што кінулі свой светлы
Куток, маленькую радзіму...

І толькі пераважна ў святы
Лятуць у родныя гняздоўі,
Туды, дзе юная крылатасць
Іх ацяплялася любоўю,

Туды, дзе гэтак іх чакаюць
І людзі родныя, і сцежкі —
Уся радзімачка малая,
Лагоднай сонечнай усмешкай.

— Жыві! — шапчу, як заклінанне,
Хапаючыся за надзею,
Што вёска ажыве, паўстане!
А мо ўсё ж памаладзее?..

## АШМЯНШЧЫНЕ

Дзень добры, мая Ашмяншчына!
Вітанне прымай найшчырае.
З маленства мяне ты лашчыла,
Матулечкай добрай, мілаю.



**ГІРУЦЬ-РУСАКЕВІЧ Валянціна Францаўна**

Нарадзілася 18 кастрычніка 1953 года ў вёсцы Міхайлоўшчына Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Працавала карэспандэнтам, загадчыкам аддзела валожынскай раённай газеты "Працоўная слава", на раённым радыё, загадчыкам аддзела інфармацыі Валожынскага райвыканкама. Зараз — кіраўнік народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання "Рунь" Валожынскага раённага цэнтра культуры.

Першыя вершы былі надрукаваны ў ашмянскай раённай газеце "Красное знамя" (1968).

Аўтар зборнікаў паэзіі "Я адкрываю вам душу" (1996), "Пад зоркаю лёсу" (1999), "Мовай сэрца" (2008), вершаваных кніг для дзяцей "Каляровыя вятры" (2011) і "А ці ведаеце вы?" (2013); аўтар пе-

сенных тэкстаў зборніка вакальных твораў “Беларусанька” кампазітара Уладзіміра Гаркушы (2011).

Уладальнік дыплома II ступені “Лепшы твор 2011 года” Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу ў галіне песеннага жанру (2012).

Лаўрэат Мінскай абласной прэміі ў галіне літаратуры ў намінацыі “Паэзія” (2011) і ў намінацыі “Дзіцячая і падлеткавая літаратура” (2015).

Узнагароджана медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі “За вялікі ўклад у літаратуру” (2012).

Прысвоена званне “Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі” (2014).

# ЗМЕСТ

## СТАРОНКА ДАРАГАЯ


“Матуля любая, старонка дарагая...” . . . . . . . . . . 3
Дзякуй . . . . . . . . . . 4
Мой выток . . . . . . . . . . 5
Землякам . . . . . . . . . . 7
Вёсачка-матулечка . . . . . . . . . . 7
Мая маленькая радзіма . . . . . . . . . . 8
Там, у дзяцінстве... . . . . . . . . . . 9
Адкуль назва? . . . . . . . . . . 10
Спаткання радасць . . . . . . . . . . 13
Вёсцы . . . . . . . . . . 14
Ашмяншчыне . . . . . . . . . . 15
Валожын . . . . . . . . . . 16
Валожыншчыне . . . . . . . . . . 17
Святая крыніца . . . . . . . . . . 18
Міншчына . . . . . . . . . . 18
Прывітанне Віцебску . . . . . . . . . . 20
“Сасновы бор” . . . . . . . . . . 20
Бярэсце . . . . . . . . . . 21
“Алеся” . . . . . . . . . . 22
Нарачы . . . . . . . . . . 23
Роднай зямлі . . . . . . . . . . 24
“Буслы — прыгожыя белыя птахі...” . . . . . . . . . . 24
Беларусь . . . . . . . . . . 25
“Блакіт вачэй азёравых...” . . . . . . . . . . 25
Дай жа, Божанька . . . . . . . . . . 25
“Упала зернейка ў раллю...” . . . . . . . . . . 26
Дажыначнае . . . . . . . . . . 27
Хлеб і песня . . . . . . . . . . 28


## РОЗДУМ НАД СЛОВАМ


“Званы царквы ў вышыні неслі славу...” . . . . . . . . . . 29
У Барысаве . . . . . . . . . . 30
Свята Роднага Слова . . . . . . . . . . 31
“Паўтысячы гадоў...” . . . . . . . . . . 32
Аб песнярах зямелькі нашай . . . . . . . . . . 33
У Вязынцы . . . . . . . . . . 34
Якубу Коласу . . . . . . . . . . 35

"Мы ганарымся спадчынай сваёй..." . . . . . . . . . 36
"Мы вучымся ў вас любіць Радзіму..." . . . . . . . 37
Кніга . . . . . . . . . . 37
Мова . . . . . . . . . . 38
Сляды-радочкі . . . . . . . . . . 39
"З табой няпроста..." . . . . . . . . . . 39
"Чаўнаком снуе аловак..." . . . . . . . . . . 41
"Белае поле зярняткамі літараў..." . . . . . . . . 41
"Як сказаць, каб цесна словам..." . . . . . . . . 42
"Не дай мне, Божухна, прашу, не дай..." . . . . . . 43

УДЗЯЧНА-СВЕТЛЫ УСПАМІН...

На сцежках Залесся . . . . . . . . . . 44
Максіму Багдановічу . . . . . . . . . . 45
У Ракуцёўшчыне . . . . . . . . . . 45
Ракуцёўскім летам . . . . . . . . . . 46
Нарачы Максіма Танка . . . . . . . . . . 48
"Вятры часоў тых наляталі..." . . . . . . . . . . 49
П. І. Біталю . . . . . . . . . . 49
"Крыўдна... Балюча... Горка..." . . . . . . . . . . 51
"Слава... Саша... Ваня..." . . . . . . . . . . 52
"Агеньчык дабрыні..." . . . . . . . . . . 52
Твая зорка пагасла, тата... . . . . . . . . . . 53
Матулі . . . . . . . . . . 53
Маім родным . . . . . . . . . . 54
Дзякуй, спадарыня памяць . . . . . . . . . . 55
"Хоць не заўсёды яго разумею..." . . . . . . . . . . 56

ЗЯМНЫ ПАКЛОН

"Квітнее май блакітны і зялёны..." . . . . . . . . 57
"Пройдземся сцежкамі тымі..." . . . . . . . . . . 58
Бессмяротны полк . . . . . . . . . . 58
Ветэранам . . . . . . . . . . 59
Вызваленне . . . . . . . . . . 60
"Нялёгкаю і доўгаю дарогай..." . . . . . . . . . . 61
"Я не ведала тых пажарышчаў..." . . . . . . . . . . 61
Салдацкім удовам . . . . . . . . . . 62
Ля абеліска . . . . . . . . . . 63
Паклонімся ветэранам . . . . . . . . . . 65
Не забыцца . . . . . . . . . . 66
"Цвітуць каштаны, пеняцца сады..." . . . . . . . . 66
Памяць . . . . . . . . . . 67

На выставе А. Савіцкага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

Я хачу падарыць вам... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
“Са святам! З Божым нараджэннем!..” . . . . . . . . . . . . . 70
“Няхай Вам Бог даруе сілы...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
“Тады марозы, пэўна, слаўныя былі...” . . . . . . . . . . . . . 71
“Мелодыя вольнаю птушкай...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
“Пісаць-тварыць...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Нашы кветкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Храм Кнігі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Выпускнікам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Юліі Несцярэнцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
“У важкі юбілею дзень прыміце...” . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Віншую . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Абаронцам Айчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Жанчынам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Унуку-першынцу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
Мае зоркі, кветкі, песні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Дзецям . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
“Помніце...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Аднакласнікам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
Сябрам юнацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
“І зноў хаджу па сцежках маёй памяці...” . . . . . . . . . . . 87
Студэнцкае брацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
“Лёс у кожнага свой і свая пуцявіна...” . . . . . . . . . . . . . 88

ПОРЫ ГОДА

Прадвесне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Вясновы лес . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
“Так па-юнаму вабіць-чаруе...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
“Дарэмна гаварылі, што вясна...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
“Ну чаму такая прыгажосць...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
“Усеабдымная любоў...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
“Сонейка ўсходзіць...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
“Майскі бэз, ты проста цуд...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
“Цёплы дождж бярозкам вымыў косы...” . . . . . . . . . . . 95
Летні дождж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
“Абуджальна адкрыю акно...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Летнім ранкам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Лясная казка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97

“Дожджык шэпчацца з зямлёй...” . . . 97
“Гэтак хуценька...” . . . 98
“Ой, не праспі раніцы...” . . . 98
“А вы на возеры бывалі рана...” . . . 99
“Сонца сыпле золата іскрынкі...” . . . 99
“На ўзбярэжжы, у акружэнні лоз...” . . . 100
Непаўторнасць . . . 100
“Васількова-рамонкавы сон...” . . . 101
Сяброўцы-рамонцы . . . 102
Летняя раніца . . . 102
Прадвосенне . . . 103
“Летне-восеньскі дыван…” . . . 104
“Да пабачэння...” . . . 104
“У палітру адну лета й восень сабралі...” . . . 104
“Гусей чародкі ў вырай адляцелі...” . . . 105
“Не верыць сэрца ўсё: няўжо...” . . . 105
“Першыя пырскі фарбы асенняй...” . . . 105
“Зноўку золатам аздобіла...” . . . 106
“Колькі ж фарбаў у ранняй восені!..” . . . 106
“Па родных нівах плач панеслі...” . . . 106
“Кастрычнік ўжо на пятк і верасню... ” . . . 107
“Волгла набрынялыя аблокі...” . . . 107
Восені . . . 108
“Лісце асенняе з клёнаў” . . . 109
Восень . . . 110
“Плача роспачна восень...” . . . 110
“Вогненна-рыжыя коні...” . . . 111
“Ці-то восень так надоўга загасцілася...” . . . 112
“Гэта ўжо й не смешна...” . . . 112
“Дачакаліся: асмялелая...” . . . 113
Зімовае . . . 113
“На сваіх ледзяных цуда-кроснах саткала...” . . . 113
“Белая фея Зіма...” . . . 114
“Зімка зноўку засявае...” . . . 114
Заінелая казка . . . 115
“Чую мелодыю зор...” . . . 116
Кругагод . . . 116

## ШЧАСЦЯ НЯМА БЕЗ КАХАННЯ

“Зноў памяць душу сагравае...” . . . 118
“Маладзіком падаўся ветах зноў...” . . . 118
“Мы нібы зноў вярталіся ў юнацтва...” . . . 119
Першае каханне . . . 119

"Цябе ніколі..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
"Фіранку шэрую..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
"Я табе нічым не абавязана..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
"І зноў вясна трывожыць сэрца..." . . . . . . . . . . . . . . . . 122
"Як пявуча плачуць капяжы..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
"Навальніцаю нечаканай..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
На Нарачы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
"Плыў над возерам вальс сустрэчы..." . . . . . . . . . . . . . . 124
"Разганяе вятрыска аблокі..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
"У цямнеючым небе дзве зоркі..." . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
Я прыдумала Вас . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Ой, крынічанька-крыніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Наша песня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Каханне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
"А я хаджу ўсё, шукаю..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
"Мне столькі трэба Вам сказаць..." . . . . . . . . . . . . . . . . 130
"Адхлынула горка-пенна..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
"Я Вам пішу…" . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
"Спаралелілі..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
"Мая бясконцая пяшчота..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
"Калі часам не збыліся мары..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Разляцеліся дарожкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
"Зорка яркая загарэлася..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
"Маё каханне нібы лебедзь белы..." . . . . . . . . . . . . . . . 135
Будзь са мной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
"Дожджык імжыць паволі…" . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Зімовае спатканне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Валажанка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
"Сцвярджае мудрасці крыніца..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
"Сціскае сэрца боль бяды..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
"Што ты, поўня, нарабіла..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
"Пуста… Холадна… Адзінока…" . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
"Так хочацца верыць!.." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
Мелодыя кахання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
"Аб чым шапочуць дрэвы ў лесе..." . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Купальскі сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
"Бясконца піць пяшчоту слоў тваіх..." . . . . . . . . . . . . . . 144
"Як даўно я не бачыла..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
"Такія чыстыя..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
"Ты мяне не прагоніш, не..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
"Хваляй накрые дваіх..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
"Пакорліва схілю калені..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
"Зноў плынь жыцця..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146

Наша казка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
“Восеньскімі матылькамі лісце...” . . . . . . . . . . . . . . . 148
“Да берага Спаткання...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
“Стукнуў у акенца...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
“З дух калаўротаў ніткі...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
Нашы галінкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150
Сыну . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
Сям’я . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
“Гадоў пражытых разам іней...” . . . . . . . . . . . . . . . . 153

НЕ СПЯШАЙ, МОЙ ЧАСЕ

“Час няўмольны, нібы на рамонках...” . . . . . . . . . . . . 154
“Адкруціся, вiток няўмольных гадоў...” . . . . . . . . . . . 155
“Гады асеннімі лістамі шапацяць...” . . . . . . . . . . . . . 155
“У жыццёвых бурах не зламацца...” . . . . . . . . . . . . . . 156
“Мае вёсны, мае леты заасенілі...” . . . . . . . . . . . . . . 157
Пакіньма наракаць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 158
Мая малітва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
“Якасцямі лепшымі спрадвеку...” . . . . . . . . . . . . . . . 160
“У дабрыню я верыць не стамлюся...” . . . . . . . . . . . . 160
Дай, дружа, руку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161
Душа баліць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162
“Асвяці, Божа, сэрцы тых...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 163
“Я прашу: будзь маёй святой...” . . . . . . . . . . . . . . . . 164
“Не, рук бяссільна я не апушчу...” . . . . . . . . . . . . . . . 165
“Так многа памылак...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
“Дождж даўно...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
Веру! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
“Дзе вы, зоры мае світальныя...” . . . . . . . . . . . . . . . . 168
“Няхай сабе за годам год імчыць...” . . . . . . . . . . . . . 168
“Якое ты цудоўнае, жыццё!..” . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168
“Колькі ні жыві...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 169
У старым парку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
Карані і крона . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 171
Даруйце... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
“Грубыя словы, душы згрубелыя...” . . . . . . . . . . . . . . 174
Бяссонніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176
“Пераніззаць каб пацеркі гадоў...” . . . . . . . . . . . . . . . 176
“Непагоды полаг шэры...” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
“І зноў апошні ліст з календара...” . . . . . . . . . . . . . . . 177
Навагоддзе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
Размова з Музай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179
“Багіня ясная Зары Світальнай...” . . . . . . . . . . . . . . . 180

Вузельчыкі на нітцы часу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181
Жыццёвы карагод . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181
Мае каралі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
Роздум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
Чысціня душы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
"Восені золата..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
Чаго журыцца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
"За залевамі, за мяцеліцай..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
Зорка лёсу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 187
"Ці так, ці так?.." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 187
"А час сляды замятае..." . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
Рэтра-стыль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
"Няхай сабе за годам год імчыць..." . . . . . . . . . . . . . . . . 189
Шчасце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 190

***Пра аўтара*** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191